Луцкевіч, Лявон
Галіна, Войцік
**“Аляксандар Уласаў”**
(сэрыя “Партрэты Віленчукоў”)

Вільня, 2000

рэдактар Алег Мінкін
макет і вёрстка Віктар Корзун

Віленскі цэнтар грамадзкіх ініцыятываў
“Дэмакратыя дзеля Беларусі”
2001 Vilnius, a/d 1021, Lithuania
Наклад 100

ISBN 9955-427-04-32



KAMUNIKAT.org

УДК 882.6-94
В 65

*Гэтым разам Лявон Луцкевіч і Галіна Войцік распавядаюць пра аднаго з буйнейшых нашых адраджэнцаў пачатку XX ст., шматгадовага рэдактара легендарнай “Нашай Нівы” Аляксандра Ўласава.*

ISBN 9955-427-04-32

© Галіна Войцік

напісаў, амаль 17 старонак. У яго ўзялі напісанае, перагледзелі й задаволена сказалі: “На обвинительный акт достаточно!” Дамоў ён ужо не вярнуўся.

Жонка шукала яго, стоячы пад вокнамі турмы, дамагалася спатканьня, але дарма. Калі яна прыносіла перадачы й пыталася ў вартавога пра мужа, той казаў: “А-а-а, гэты, зь вялікімі вусамі... Дык ад яго расказаў рагоча ўся камэра!”

Уласава судзіла асобая нарада. Далі яму 5 гадоў лягеру, і 28 лістапада 1940 г. накіравалі ў Марыінскі лягер у Навасыбірскую вобласьць. Дзякуючы моцнаму здароўю, ён дацягнуў да Навасыбірску. Памёр Аляксандар Уласаў 11 сакавіка 1941 г. Прычына сьмерці, як запісана ў пасьведчаньні, паралюш сэрца.

Жонцы й сынам пакінулі спачатку 5 га й карову, але пасьля арышту й асуджэньня Ўласава, іх вывезьлі ў Паўладарскую вобласьць. Толькі ў 1965 г. Аляксандра Паўлаўна Ўласава вярнулася ў Гомель, дамаглася рэабілітацыі мужа й пэрсанальнай пэнсіі для сябе.

Праз доўгія гады ймя Аляксандра Ўласава было пад забаронаю. Ягоныя артыкулы й фрагмэнты ўспамінаў расьцярушаныя па розных газэтах і часопісах. У энцыкляпэдычным даведніку “Літаратура і мастацтва”, а таксама ў даведніку “Беларусь” яму прысьвечаныя кароткія, сухія, са шматлікімі недакладнасьцямі артыкулы.

Аляксандар Уласаў ніколі ня гнаўся за славай. У лісьце да кс. Адама Станкевіча з нагоды юбілею апошняга ў 1939 г., ён пісаў: “Я належу ўжо да старэйшага пакаленьня й барабаню пра беларусаў гадоў 50. Усе нашы праваднікі на беларускай справе кар’еры не зрабілі. Жыцьцё іх горкае, мучаніцкае і ідуць яны не па кветках, а па калючках...” Ясна, што, пішучы гэтыя словы, Аляксандар Уласаў меў на ўвазе й свой уласны лёс, усё сваё жыцьцё, поўнае шчырых парыванньяў, радасьці ад асобных посьпехаў ды горычы ад шматлікіх расчараваньняў. А было гэта напісанае напярэдадні вялікага пералому, каторы, як не парадаксальна, прынёс яму асабіста яшчэ адно цяжкое і ўжо апошняе расчараваньне...

ў сад. Яна пайшла й паклікала: “Пан сэнатар!”. І раптам пачула аднекуль з гары: “Гоп, гоп!” Узьняла галаву, а на дрэве нейкае вялізнае, праве, голае цела. Ад нечаканасьці амаль не самлела.

Калі дзядзька зьбіраў гасьцей, дык за вячэрай хадзіў каля стала й казаў: “А Божа ж мой, ня ежце гэтак шмат, гэтак вы мяне зруйнуеце!” Госьці рагаталі, і нідзе, здаецца, як у яго так смачна ня елі й не пілі. А сам дзядзька Саша мог зьесьці яечню зь 10 яек на сале, а ў пост — на алею. Моладзь яго надта любіла за ягоныя жарты, за любоў да спорту, за кнігі, каторыя ён пазычаў са сваёй багатай бібліятэкі, за добрыя парады. Увечары прыходзілі суседзі зь Мігаўкі, Шалухічаў, Пяцюлей. Дзядзька чытаў ім газэты й распавядаў, што дзеецца ў сьвеце. Будучы сэнатарам, ён бараніў пакрыўджаных. Каб вучням было лягчэй вучыцца, ён прыняў прапанову мэтадастаў з Варшавы, якія арганізавалі ў Радашковічах інтэрнат для хлапцоў і дзяўчатаў: такім чынам яны мелі бязплатную кватэру, сьвятло й апал... На жаль, на новых выбарах ён ужо ў Сэнат не патрапіў”.

Надыйшоў 1939 г. Уласаў не заплаціў 100 злотых на ваенную пазыку, за што патрапіў на “чорную дошку”. Далі 4 дні, каб даставіў 60 пудоў жыта. За сабатаж гразіла зьняволеньне ў Куртуз-Бярозе. Але 17 верасьня Заходнюю Беларусь акупавалі савецкія войскі. Уласаў узяў кошык яблыкаў і, у акружэньні дзяцей, пайшоў сустракаць Чырвоную Армію.

Камітэт беднаты даў яму, як народнаму інтэлігенту, 5 га зямлі. Часовая ўправа ў Радашкавічах зацьвердзіла гэтае пастанаўленьне. Аднак неўзабаве сытуацыя зьмянілася. Уласаву сказалі, што ён ёсьць “помещик” (60 га), і загадалі пакінуць Мігаўку. Яму ў той час было ўжо 65 гадоў, зь ім была жонка ды два сыны. Ён хацеў яшчэ працаваць дзеля дабра Беларусі, цешыў сябе ілюзіямі, што пры новай уладзе зможа пісаць успаміны, каб паказаць моладзі, як змагаліся за Беларусь пры розных рэжымах.

І вось неяк ён паехаў у Маладэчна, зайшоў у аддзел асьветы. Адтуль яго накіравалі ў НКУС. А тамака яму ветліва сказалі: “Сядьте и опишите подробно свою деятельность”. Ён сеў і



Аляксандар Уласаў — вельмі яскравая ды калярытная постаць у гісторыі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Вонкава ён, мусіць, як ніхто з нашых адраджэнцаў, якіх дзейнасьць распачалася на самым пачатку XX ст., кідаўся ў вочы сваёй імпазантнасьцю. Высокі, магутны, у маладыя гады насіў модна падкручаныя вусы. У сталых гадох распаўнеў. Гаварыў гучным басам: ціха ён проста ня мог гаварыць. А калі клікаў некага, дык голас ягоны чуўся далёка. Любіў пасьмяяцца, пажартаваць, меў глыбокае пачуцьце гумару й ня траціў яго нават у самых цяжкіх сытуацыях.

Нарадзіўся Аляксандар Уласаў 16 жніўня 1874 г. у вялікай сям'і начальніка пошты, у Вялейцы. Ягоны бацька, Мікіта Ўласаў, купіў фальварак Мігаўка каля Радашкавічаў, куды высылаў на лета сваю сям'ю. Па некаторым часе яго накіравалі працаваць у Вільню, дзе Аляксандар пачаў вучыцца. Пазьней ён перайшоў у духоўную сэмінарыю ў Пінску, ды ўрэшце закончыў сярэднюю адукацыю ў Менску. У 1899 г. паступіў у Рыскі палітэхнічны інстытут. Быў ён, паводле сьведчаньня Веры Ніжанкоўскай, “здольны, але лянівы”, і належыў да г. зв. “вечных студэнтаў”. Інстытут так і ня закончыў. Яшчэ ў студэнцкія часы захапіўся рэвалюцыйным рухам й браў рупны ўдзел у дэманстрацыях студэнтаў і рабочых. (Наогул, у сваіх успамінах Вера Ніжанкоўская часта гаворыць пра дзіўнае спалучэньне ў характары “дзядзькі Сашы” флегматычнасьці й энэргіі).

У 1904 г. уступіў у Беларускую Рэвалюцыйную Грамаду. Тады-

ж у рады грамадоўцаў уліліся Антон Трэпка і Бранiслаў Тарашкевiч — абодва пецярбургскiя студэнты, Казiмiра Яноўская, Сьцяпан Багушэўскi (студэнт). Напрыканцы 1905 г. Уласаў браў удзел у партыйным (дэлегацкiм) зьезьдзе БРГ. На зьезьдзе была прынятая назва партыi, быў абраны ейны Цэнтральны камiтэт, у якi ўвайшлi I. i А. Луцкевiчы, А. Уласаў, В. Iваноўскi, А. Бурбiс.

Напрацягу 1906 г. менскiя грамадоўцы, Бурбiс, Шабуня, Уласаў, Яноўская, Скандракоў, Каганец, Куколь, Лянкоўскiя ды iнш. (Луцкевiчы, каб пазьбегнуць арышту, пераехалi ў Вiльню), разгарнулi шырокую дзейнасьць сярод рабочых i вялi сталую рэвалюцыйную працу на вёсцы. Уласаў разам з Бурбiсам арганiзавалi забастоўку шаўцоў, музыкантаў, цырульнiкаў. Падчас перадвыбарчай кампанii ў Дзяржаўную Думу Ўласаў агiтаваў за кандыдатаў ад дэмакратычных партыяў, праз што патрапiў у няласку да царскiх уладаў.

Вельмi важны пэрыяд у дзейнасьцi А. Уласава гэта ягоная праца ў газэце “Наша Нiва”. Як ведама папярэднiцай “Нашай Нiвы” й першай бел. легальнай газэтай была “Наша доля”, арганiзатарам i спонсарам якой быў I. Луцкевiч. Усяго выйшла 6 нумароў “Нашай долi”, газэта мела радыкальны напрамак, яе часта канфiскоўвалi й нарэшце забаранiлi зусiм, а рэдактара й выдаўца Тукеркiса асудзiлi на год крэпасьцi. У “Нашай долi” сабралiся ў адно аддадзеныя бел. справе энтузiясты: I. i А. Луцкевiчы, А. Пашкевiч (Цётка), Ядвiгiн Ш. ды iнш. Яны й пачалi выдаваць новую газэту,”Нашу Нiву”. Выдаўцам i рэдактарам першых 4-ох нумароў газэты быў Зыгмунт Вольскi, ад пятага нумару — Аляксандар Уласаў. На ведамым групавым здымку 1910 г. бачым Iвана й Антона Луцкевiчаў i Аляксандра Ўласава — кiруючую тройку газэты. Як найстарэйшы векам, а таксама як той, хто мог зыходзiць за абшарнiка (бацька, расеец, меў фальварак 60 га пад Радашкавiчамi), Уласаў быў найбольш адпавядны кандыдат на рэдактара й выдаўца. Умеў ён таксама знаходзiць таленавiтых людзей i прыцягваць iх да працы ў





*Сям’я Ўласавых. 1927 г.*

Калi прыяжджалi госьцi, Саша аглушальным басам зваў сваю гаспадыню: “Анатоля, гоп, гоп!” Калi госьцi былi Анатолi да спадобы, яна прыносiла яечню, масла, сыр, кiўбасы; калi не — казала, што нiчога няма, i нiякiя ўгаворы дзядзькi не памагалi.

У садзе былi спартовыя прылады, i ўся моладзь мусiла практыкавацца. А вечарам у старым доме дзядзька запальваў у камiне, перад iм клалi посьцiкi, мы сядалi на падлогу, пiлi каву й слухалi найчасьцей дзядзку. А старэйшыя сядалi на надзвычай вялiкую канапу, каторая мела каля 5 мэтраў даўжынi.

Калi было горача, дзядзька хадзiў у адных шортах (тады гэта была рэдкасьць), а такi волат, як ён, выглядаў досыць арыгiнальна. Нават здаралiся зь iм анэкдоты. Прыехаў нейкi беларус з ваколiцаў Вiльнi й пайшоў зь дзядзькам у сад. Тымчасам прыйшоў нейкi селянiн па раду. Яго паслалi ў сад, але ён хутка вярнуўся перапалоханы ды кажа: “Там нейкi голы вар’ят ходзе, а каля яго, мусi, фэльчар круцiцца, i ўсё яго ўгаворвае!” Аднаго разу прыйшла нейкая дзяўчына, i яе паслалi

чытаў, вывучаў аграрную праблему ў Беларусі, пісаў на гэтую тэму артыкулы. Тут, у Мігаўцы, часта зьбіраліся госьці: сваякі, знаёмыя, вучні з бацькамі. Ладзіліся тэатралізаваныя прадстаўленьні, гульні. Гаспадар быў заўжды рады гасьцям, умеў іх заняць, рассьмяшыць. Вельмі цікава й вобразна апісвае Мігаўку Вера Ніжанкоўская:



Аляксандар і Аляксандра Ўласавы. 1926 г.

“Праводзячы шмат часу ў гімназіі, сам дзядзька жыў у Мігаўцы, куды прыяжджалі да яго беларусы з усіх канцоў Заходняй Беларусі. У Мігаўцы я пазнаёмілася й з Браніславам Адамавічам Тарашкевічам.

Дзядзька лічыўся вялікім арыгіналам. У ягоным зашклёным ганачку стаяў стол, наўкол лавы, на маленькім століку незгасаючы прымус з чайнікам. На стале без абруса — шклянка, цукар, бохан хлеба, кавалак вэнджанай шынкі. Дзядзька, босы, у саматканым касьцюме, аблажыўшыся кнігамі, чытае й п’е гарбату.





KAMUNIKAT.org

Нашаніўцы: І. Луцкевіч, А. Луцкевіч, А. Уласаў. 1910 г.

“Нашай Ніве”. Напачатку выданьня ён нават часткова фінансаваў газэту, выпрошваючы грошы ў багацейшых знаёмых, бо ягоныя ўласныя даходы зь Мігаўкі былі мізэрныя. Але найбольш справай фінансаваньня займаўся І. Луцкевіч, каторы скупляў антыкварныя рэчы, рэстаўраваў іх, а пасьля прадаваў тыя зь іх, што не датычылі бел. культуры, ды аддаваў грошы на газэту. Фінансавала зазэту й Магдалена Радзівіл.

Аляксандар Уласаў быў здольны журналіст, у маладосьці яму прарочылі кар’еру літаратара-гумарыста, аднак пісаў ён на эканамічныя, аграрныя ды іншыя гаспадарчыя тэмы. Магчыма, што некаторыя перадавіцы ў “Нашай Ніве” напісаныя

Ўласавым. Пэўны час вёў ён таксама й рэдакцыйную пошту, пра што сьведчыць жартаўлівы стыль адказаў ад рэдакцыі. Сам Уласаў пісаў ва ўспамінах, надрукаваных у 1936 г. у часопісе "Калосьсе": "Пачатак беларускай прэсы быў весь на ахвярах і цяжкой начной працы. Паўтара году мы з Антонам Луцкевічам (А. Навіна) пісалі ад вечара да раніцы. Як мы вытрымалі гэтую работу, я не разумею: моладасьць, нязломная воля, энтузіязм. Трэба было вырабляць літаратурную мову. Пазьней зьявіліся памацнікі".

У "Нашу Ніву" пісалі Цётка, Ядвігін Ш. З 1908 да 1909 у ёй працаваў Янка Купала. У 1912 прыехаў у Вільню й працаваў стала ў "Нашай Ніве" Зьмітрок Бядуля. З 1909 г. сакратаром газэты, а ў 1912-13 гг. і ейным фактычным рэдактарам быў, паводле І. Дварчаніна, Вацлаў Ластоўскі. Тут працаваў і Якуб Колас. У сваіх успамінах Уласаў піша:

"Прыйшоў у рэдакцыю да нас урэшце і Якуб Колас. Далі яму адпаведную работу.

Прысылалі ў "Нашу Ніву" многа вершаў, расказаў карэспандэнцыяў. Колас меў многа працы. З благіх вершаў рабіў добрыя, і местачковы вершаплёт, прачытаўшы свае вершы сваім знаёмым, дзівіўся разам з імі: якія пекныя вершы!

Колас унёс многа гумару ў рэдакцыю; чалавек ён быў жыцьцярадасны, у жыцьцё нашае "богемы" ўносіў у вольныя хвіліны многа вясельля. Помню, раз цэлую ноч працавалі ў рэдакцыі на рагу Завальнай і Троцкай у Вільні. Колас а гадзіне трэцяй ночы кажа: "Вот бы выпіў гарэлкі!". "На грошы і купі!" Колас за паўгадзіны вярнуўся з цёмнай вуліцы і кажа: "Няма, усё зачынена! Тут і гэнэрал не дастане!" Пайшоў я. Пытаюся ў гарадавога: "Калі ласка, гдзе тут можна дастаць гарэлкі?" "Ды вось, у стоража пад N 58"...

"За ўвесь час свайго існаваньня "Наша Ніва" гуртавала ля сябе ўсю сьвядомую Беларусь, на яе старонках вырасьлі літаратарныя іменьні выдатнейшых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў," — пісаў М. Гарэцкі. Падобным чынам



чайнік варатку (быў у нас пяцілітровы чайнік). У гэты вараток ён сыпаў шмат заваркі-гарбаты, піў чай, чытаў, — і так праводзіў частку ночы, а мо і ўсю ноч, бо чайнік раніцою быў амаль парожні, а Ўласаў скардзіўся, што спаў дрэнна. Раніцою ехаў па нашых справах, а адтуль адразу зноў у Варшаву.

Нягледзячы на стомленасьць, гумар наш сэнатар меў заўсёды добры. Аднойчы, памятаю, гэты ягоны гумар моцна падвёў і яго, і нас. Трэба было арганізаваць акружную ўправу ў Ваўкавыску. Мы мусілі сьпісацца з тамтэйшымі сябрамі адносна памяшканьня з тым, каб, паведамляючы старостваа пра зьезд, падаць дакладную дату, гадзіну ды адрас памяшканьня. На зьезд староства выслала свайго прадстаўніка ў постаці паліцыянта або тайніка. Звычайна такі зьезд адбываўся ў гасьцініцы. Вось старшыня Гал. Управы й кажа Ўласаву, што яму давядзецца паехаць на арганізацыйны зьезд у Ваўкавыск прыблізна праз два тыдні, у працягу якіх мы пасьпеем сьпісацца адносна памяшканьня. Сэнатар жа на гэта адказаў, што ня трэба сьпісвацца, а адразу паведамляць староства й гурткі, што у наступную нядзелю, а 15 гадзіне ў памяшканьні гасьцініцы "Эўропа" адбудзецца зьезд. Мы гэтак і зрабілі, бо нам фактычна важна было падаць назоў гасьцініцы. Праз пяць дзён, у суботу, атрымліваем ад старосты ліст, у якім зазначаецца, што ў Ваўкавыску гасьцініцы з назовам "Эўропа" няма. Ясна, што зьезд узаўтра адбыцца ня можа і паведаміць сяброў на вёсцы ўжо няма часу. Прыехаў Уласаў. Старшыня паказвае яму ліст ад старосты. Прачытаў, крыху падумаў дый кажа: "Нейкі дзівосны горад Ваўкавыск. У кожным горадзе ёсьць гасьцініца "Эўропа", а там няма!" Памінаючы гэты кур'ёзны факт, трэба зазначыць, што акружная ўправа ў Ваўкавыску крыху пазьней была арганізаваная. Уласаў, дзе толькі была неабходнасьць, стараўся памагчы гурткам у працы".

Жыў А. Уласаў у сваім фальварку Мігаўка. Ён сам гаспадаркай не займаўся, меў арэндатара, каторы яго ашукваў, як мог, і Мігаўка амаль не давала прыбытку. Сам гаспадар шмат

Пятром Шчасным, Алёнай Сокалавай-Лекант ды інш.

Польскія санацыйныя ўлады ўважалі Радашкоўскую гімназію за рассаднік камунізму ды ўсялякімі спосабамі перашкаджалі ў працы. Калі ў 1929 г. гімназія была зьліквідаваная, засталіся неаплочаныя пазыкі — 850 злотых (вялікія як на тыя часы грошы!) і заплаціць іх мусіў сэнатар Уласаў, канцэсіянэр гімназіі. У яго, як амаль заўсёды, грошы не было. Ён узяў бохан хлеба й кавалак сала ды пайшоў у Маладэчна адседжваць пазыкі. Павятовы начальнік папрасіў сьпіс арыштантаў. Чытае: “Уласаў... Хто такі Уласаў? Гэта сэнатар? Зараз-жа звольніць!” Так Уласаў ачысьціўся ад пазыкаў.

Закрыцьцё гімназіі, у арганізацыю якой ён уклаў столькі энэргіі й клопату, было для яго цяжкім ударам. Аднак ён працягваў працаваць у ТБШ, гурток якога стварыў у Радашкавічах. Яшчэ ў 1927-28 гг. ён адначасна з сэнатарствам спаўняў абавязкі старшыні Галоўнай Управы ТБШ, аддаючы шмат часу працы ў таварыстве, арганізоўваючы бел. школкі, розныя курсы й іншую культурна-асьветніцкую працу ў гуртках гэтае масавае ў тыя гады арганізацыі. Надзея Шнаркевіч, якая ў той час працавала сакратаром у Галоўнай Управе ТБШ, успамінае:

“Хаця арганізацыя гурткоў і акружных упраў вымагала менш фармальнасьцяў адносна польскай улады, чым адкрыцьцё беларускай школы, усё ж яна, а асабліва праца ў іх, патрабавала дапамогі паслоў. Паслы ж былі ўжо арыштаваныя. Тут таксама, як толькі мог, дапамагаў сэнатар Уласаў. Частагуста, прыехаўшы ў суботу ў Вільню, даведаўшыся, што ў нядзелю трэба ехаць у той ці іншай справе на правінцыю, — ён ня ехаў да сям'і дамоў, каб адпачыць. А трэба сказаць, што такі адпачынак, хаця б невялічкі, пры ягоным стане здароўя быў неабходны. Уласаў заставаўся начаваць тут у кабінэце старшыні за шафай. Там на падлозе ляжаў нейкі спружынавы матрац. Тут наш сэнатар клаўся, вымаў з партфэлю кнігі, каторыя заўсёды меў пры сабе, прасіў загатаваць яму вялікі



характэрызуе газэту й І. Дварчанін у прадмове да сваёй “Хрэстаматыі беларускай літаратуры”: “Выдатнейшыя дзеячы, якія стаялі на чале ўсяе працы каля “Нашае Нівы”, былі: браты Іван і Антон Луцкевічы, Аляксандар Уласаў, Антон Лявіцкі, Алаіза Пашкевіч і потым усе пісьменьнікі, творы якіх будуць тут пададзены”.

У лютым 1914 г. рэдактарам і выдаўцом “Нашай Нівы” стаў Янка Купала, які кіраваў газэтай да канца — да восені 1915 г. А. Уласаў быў рэдактарам сельскагаспадарчага часопісу “Саха”, які выходзіў з красавіка 1912 да кастрычніка 1913 у Вільні, у лістападзе-сьнежні 1913 у Менску, пасьля перапынку, у красавіку-траўні 1920, у Менску й ад сакавіка 1927 да жніўня 1931 зноў у Вільні. Уласаў быў рэдактарам “Сахі” у 1912-13, 1915, 1928-29 гг. Ён прыцягнуў да працы шырокае кола аграномаў, студэнтаў сельскагаспадарчага інстытуту, гаспадароў-землеробаў. Сам таксама пісаў на аграрныя тэмы.

Лічыўся А. Уласаў і рэдактарам-выдаўцом літаратурнага й навукова-папулярнага ілюстраванага часопісу для моладзі “Лучынка”, хаця літаратурным дый фактычным рэдактарам “Лучынкі” была Цётка. Уласаў выступаў на старонках часопісу з артукуламі. Выйшла 6 нумароў. Рэдакцыя спрабавала наладзіць выданьне літаратуры для дзяцей, выпусьціла ў ў 1914 г. зборнік апавяданьняў — пераклад з польскай мовы.

У 1913 г., пакінуўшы ў “Нашай Ніве” годнага сябе рэдактара Я. Купалу, Уласаў пераехаў зь Вільні ў Менск. Там ён распачаў бурлівую дзейнасьць, і хаця любіў паўтараць: “Усё будзе добра, толькі нічога ня трэба рабіць!”, — але сам не прытрымоўваўся гэтага прынцыпу. У Менску была адчыненая “Беларуская хатка”, у якой зьбіраліся беларусы, моладзь. У Менску ў той час працавалі У. Галубок, Ядвігін Ш. і ягоная дачка Ванда Лявіцкая, З. Бядуля, Ф. Шантыр, Я. Крыўка, А. Смоліч ды інш. Калі пачалася І Сусьветная вайна, і фронт хутка пасоўваўся на ўсход, у Менск прыехала Л. Сівіцкая (Зоська Верас). Горад напоўнілі ўцекачы, і для іх трэба было стварыць сталоўкі,

мейсцы начлегу й работы. Уласаў браў актыўны ўдзел у тагачасным жыцьці Менску.

У 1918-19 гг., калі вайна закончылася, ён надрукаваў у часопісе "Экономическая жизнь" манаграфію з гісторыі аграрнага пытаньня ў Беларусі й дамработніцкіх промыслаў, сабраў эканамістаў і пачаў вялікую работу. Рыскі трактат засьпеў яго ў Радашкавічах, дзе ён і застаўся жыць у акупаванай Польшчай Заходняй Беларусі, не спыняючы барацьбы за беларускае школьніцтва, прэсу.

Уласаў быў цесна зьвязаны зь віленскім беларускім асяродзьдзем, што паспрыяла ягонаму абраньню сэнатарам у польскі сойм у 1922 г. На гэтым становішчы ён шмат зрабіў для абароны правоў беларускага народу ў Польшчы, для асьветы на роднай мове. Яшчэ ў 1921 г. ён пачаў змаганьне за адкрыцьцё бел. гімназіі ў Радашкавічах, за што адседзеў нейкі час у канцлягеры ў Стжалкове. Вось што пісала пра знаходжаньне ў ім Уласава ягоная жонка Аляксандра Ўласава ў 1972 г. у лісьце да Новіка-Пяюна: "Барак дашчаны ды пахлёбка, народу пяць тысячаў, голых, босых. Дзякуючы дыпляматычнаму розуму, А. М. (Аляксандар Мікітавіч — заўв. Г. В.) арганізаваў увесь лягер народу і паслаў заяву ў Лігу Нацыяў. Прыехала камісія ў Варшаву й паехалі ў лягер пераканацца. Варшава закружылася. Распусьцілі ўвесь лягер, а Ўласава вызвалілі першай тэлеграмай з Варшавы".

Ад свайго намеру адкрыць гімназію не адступіў і, ужо будучы сэнатарам, абіваў парогі розных інстанцыяў і, нарэшце, дамогся свайго: атрымаў канцэсію на адкрыцьцё гімназіі. Польскія ўлады доўгі час не хацелі зацьвердзіць дырэктара гімназіі, матывуючы гэта недастатковай кваліфікацыяй кандыдатаў. Ейным дырэктарам стаў Фэлікс Стэцкевіч, юрыст паводле адукацыі (закончыў Пецярбургскі ўнівэрсытэт, выкладаў лаціну). У Радашкоўскай Беларускай Гімназіі працавалі Сымон Кароль, Леанід Шчансновіч, Кацярына Жэлязоўская, Зінаіда Кароль ды інш.





*Беларускія Настаўніцкія Курсы пры Радашкаўскай Беларускай Гімназіі. 1927 г.*

Вучнёўская плата за навуку (дый ня ўсе маглі плаціць) была недастатковая для ўтрыманьня гімназіі. Уласаў дапамагаў гімназіі з свайго сэнатарскага ўзнагароджаньня. Апрача таго ён навязаў кантакт з амэрыканскімі мэтадыстамі, якія стварылі ў Радашкавічах два інтэрнаты, адзін для дзяўчатак, другі для хлопцаў. Тут вучні зь бедных сем'яў мелі дах над галавой і харчаваньне. Мэтадысты аказвалі вучням і матар'яльную дапамогу.

Гімназія насіла ймя Скарыны, напачатку ў ёй было шмат жыдоў, як і ў Віленскай Беларускай Гімназіі, але паступова яна рабілася ўсё больш беларускай. Існавала яна 7 гадоў, ад 1922 да 1929. За гэты пэрыяд у ёй вучылася 860 вучняў, большасьць зь сялянскіх сем'яў, 120 з каторых закончыла гімназію. Летам 1926 г. Уласаў арганізаваў пры ёй курсы для настаўнікаў бел. пачатковых школаў, у 1927 г. — курсы для выкладчыкаў іншых бел. гімназіяў, заняткі на якіх вяліся настаўнікамі ВБГ: Сяргеем Паўловічам, Натальлей Банцлебэн,



KAMUNIKAT.org